# ПРАВЯДЗЕННЕ КАМАСАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ ДРАГІЧЫНСКАГА ПАВЕТА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА ў 1921-1939 гг.

В.П. Гарматны
*Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт, г. Баранавічы, Беларусь*

Камасацыя (хутарызацыя) – гэта адна са складовых частак аграрнай рэформы польскіх улад, якая ажыццяўлялася ў 1921-1939 гг. на землях Польшчы, і найперш за ўсё Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны [11, с. 94] з мэтаю ліквідацыі цераспалосіцы і сістэмнай трансфармацыі сельскай гаспадаркі для вываду яе на новы ўзровень праз стварэнне рацыянальнай гаспадаркі, арыентацыю яе на рынак, пашырэнне і ўмацаванне таварна-грашовых адносін. Цераспалосіца абцяжарвала сялян, аказвала адмоўны ўплыў на якасць апрацоўкі зямлі і садзейнічала зніжэнню паказчыкаў ураджайнасці сялянскіх надзелаў [9, с. 60]: гаспадаранне на шматлкіх невялікіх надзелаў зямлі, аддеглых ад сябе часам на некалькі кіламетраў, было вялікаю і марнаю стратаю сіл і часу селяніна. Цераспалосіца падзялялася на ўнутраную (на абшары асобнай вёскі знаходзіліся надзелы толькі мясцовых сялян) і знешнюю (прысутнічалі надзелы сялян іншых вёсак).

Па выніках Рыжскай мірнай дамовы (18 сакавіка 1921 г.) Заходняя Беларусь (у тым ліку і Драгічыншчына) увайшлі ў склад міжваеннай Польшчы (II Рэчы Паспалітай). У адпаведнасці з прынятым у Польшчы адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаваннем заходнебеларускія землі былі падзелены на ваяводствы, паветы і гміны, у выніку чаго Драгічын стаў павятовым цэнтрам Палескага ваяводства. Плошча Драгічынскага павета складала 2 362 кв. км., колькасць насельніцтва – 63 186 (1921 г.) і 97 000 (1931 г., з іх у Драгічыне – 1 987) чалавек. Павет падзяляўся на 12 гмін: Адрыжын, Бездзеж, Брашэвічы, Валовель, Варацэвічы, Драгічын, Дружылавічы, Імянін, Моталь, Осаўцы, Хомск, Янава. На падставе распараджэння старшыні Галоўнай Зямельнай Управы (Główny Urząd Ziemski) ад 10 ліпеня 1922 г. з мэтаю ажыццяўлення сістэмнай трансфармацыі аграрнага ладу створаны павятовыя зямельныя ўправы, у тым ліку і Драгічынская.

Закон аб правядзенні камасацыі (scalenia, ссялення) прыняты Сеймам II Рэчы Паспалітай 31 ліпеня 1923 г. [15]. Працэс камасацыі быў доўгім і складаным, бо польскім уладам неабходна было правесці вялікі аб'ём падрыхтоўчых работ і скласці патрабуемыя шматлікія нарматыўна-прававыя і тэхнічныя дакументы. Улады стараліся правесці камасацыю мірна і нават дэмакратычна: ставілі пытанне хутарызацыі вёскі на разгляд на агульным сялянскім сходзе, і калі большая палова мясцовых сялян выказвалася супраць, то на гэтых умовах камасацыя не праводзілася [1, s. 163]. Паводле ацэнак тагачасных польскіх даследчыкаў для камасацыі асобнай вёскі неабходна было як мінімум 1½-2 гады, у першую чаргу для падрыхтоўкі нарматыўна-прававой і тэхнічнай дакументацыі. Для ажыццяўлення работ па камасацыі вёскі сяляне павінны былі абраць раду (савет) ссялення (rada uczestników scalenia), колькасць членаў рады залежала ад колькасці сялян вёскі і звычайна складала ад 3 да 7 чалавек [12, s. 22]. За камасацыю кожнага гектара зямлі ў залежнасці ад яе якасці сяляне павінны былі плаціць звычайна ад 14 да 20 злотых, акрамя таго, аплачвалася складанне праектаў, правядзенне меліярацыі і перанясенне дарог, утрыманне землеўпарадчыкаў і г.д.

Перад правядзеннем камасацыі мясцовыя ўлады складалі падрабязны план работ па яе ажыццяўленню, заключалі папярэднюю дамову з землямерам аб тэрмінах і ходзе выканання плануемых работ, умовах аплаты выкананай працы і г.д. Так, напрыклад, 19 ліпеня 1928 г. выконваючы абавязкі старшыні Палескай Акруговай

Зямельнай Управы (Poleski Okręgowy Urząd Ziemski, ПАУЗ) Леон Сулоўскі заключыў дамову з землямерам Уладзімірам Пагоцкім аб выкананні працы па камасацыі вёскі Асаўніца гміны Моталь агульнаю плошчаю сялянскай зямлі каля 1 019 га па кошту 18 злотых за 1 га (з іх 5% ці 917 злотых 10 грошаў выплачваліся авансам) [5, Арк. 2-3]. Паводле заключанай дамовы землямер абавязваўся распачаць працу не пазней за 25 ліпеня 1928 г. і ў сваёй працы прытрымлівацца наступнага плана: 1 стадыя: а) усталяваць абшар ссялення і вызначыць пратакол да 10 верасня 1928 г. (10% ад аплаты); б) вызначыць класіфікацыю зямель па ўраджайнасці да 10 лістапада (5%); 2 стадыя: а) вылічыць агульную паверхню аб'ядноўваемых зямель і скласці класіфікацыйны рэестр да 1 студзеня 1929 г. (10%); б) скласці агульны памярова-класіфікацыйны план становішча перад ажыццяўленнем камасацыі да 1 сакавіка 1929 г. (10%); 3 стадыя: а) на перворысе на працягу 1 месяца пасля зацвярджэння ПАУЗ старога плана зрабіць праект ссялення (10%); б) на працягу 3 месяцаў ад даты зацвярджэння зрабіць агульны план з улікам класіфікацыі зямель (25%); 4 стадыя: а) пасля паведамлення аб зацвярджэнні праекта ссялення на працягу 5 месяцаў распачаць працы на грунце (10%); б) пасля правядзення тэхнічнай рэвізіі скласці ў Драгічынскую павятовую зямельную ўправу агульны праект ссялення (3%); в) на працягу 2 тыдняў вызначыць на грунце межы новых надзелаў і скласці адпаведную справаздачу (12%); 5 стадыя: а) скончыць і накіраваць у ПАУЗ усе неабходныя дакументы на працягу 2 месяцаў; б) без аплаты выправіць на працягу 1 месяца ўсе выказаныя заўвагі наконт плануемага ажыццяўлення ссялення.

Неабходна падкрэсліць, што польскія ўлады надавалі вялікую ўвагу правядзенню камасацыі ў Заходняй Беларусі і пільна кантралявалі працу землямераў на ўсіх этапах ажыццяўлення работ. У выпадку зацягвання тэрмінаў складання планаў камасаваных зямель землямеру пагражаў штраф у 10% за кожны месяц затрымкі ад аплаты за вызначаны аб'ём работы. Так, 18 кастрычніка 1928 г. землямерам Пагоцкім усталяваны абшар ссялення Асаўніцы са спазненнем на 1 месяц. Землямер растлумачыў такую затрымку працяглай спрэчкай з-за мяжы паміж вёскай Асаўніца і мястэчкам Моталь, у сувязі з чым было вырашана не караць землямера і выплаціць яму адпаведную суму [5, Арк. 18].

Летам 1928 г. польскія ўлады вялі разбор справы землямера Мікалая Катовіча, які ажыццяўляў праект камасацыі вёскі Заверша гміны Бездзеж і прыйшлі да высновы, што праз неадпаведны падбор дапаможнага персаналу і неналежнае ажыццяўленне нагляду і кіраўніцтва з боку Катовіча землямерныя працы праводзіліся нядбала і былі некалькі раз перароблены, што ў выніку выклікала значнае зацягванне тэрмінаў. Землямера неаднаразова строга папярэджвалі аб неабходнасці своечасовага і якаснага выканання памераў, але ўсё было дарэмна. Улічваючы той факт, што працы па камасацыі Заверша не выклікала аніякіх цяжкасцяў, а таксама з-за адсутнасці юрыдычных рознагалоссяў, улады прыйшлі да высновы, што зацягванне тэрмінаў камасацыі можна паставіць у віну выключна землямеру, а далейшая яго праца не прынясе жадаемых вынікаў. У рэшце рэшт было прынята рашэнне разарваць дамову з Катовічам, абавязаць яго вярнуць атрыманыя раней грошы за ссяленне вёскі ў памеры 6 924,06 злотага і столькі ж у якасці штрафа. 19 ліпеня 1928 г. праект камасацыі вёскі Заверша перададзены землямеру Стэфану Лаўрыновічу (Пінск, вул. Краеўскага, 46) [3, Арк. 23, 42].

8 красавіка 1929 г. улады адзначалі, што землямер Ежы Ярома, які ажыццяўляў ссяленне вёскі Ласінцы гміны Брашэвічы, спазняецца ў тэрмінах выканання прац больш чым на 3 месяцы, надзеі на лепшае ўжо няма і ў сувязі з гэтым дамова аб камасацыі з ім была разарвана [8, Арк. 13].

10 кастрычніка 1930 г. землямер Тадэўш Стульгінскі тлумачыў затрымку з ажыццяўленнем камасацыі вёскі Белін гміны Осаўцы тым, што накіраваны ў вёску памочнік Ануфры Максімаў адначасова выконваў камасацыю вёскі Лассоты Брэсцкага павета, праект якой быў згублены, і яму прыйшлося ў першую чаргу знаходзіцца там. Накіраваны ў Белін на замену яму Тадэўш Зялінскі быў нечаканы выкліканы 22 верасня 1930 г. на шасцітыднёвыя вайсковыя зборы, таму затрымка з ажыццяўленнем камасацыі была не па віне землямера [7, Арк. 19].

Пры ажыццяўленні камасацыі сяляне спадзяваліся атрымаць дадатковы надзел ворнай зямлі, але ў польскіх улад не хапала на гэта свабодных зямель і ў першую чаргу сяляне павінны былі набываць яе самастойна. Так, на 1928 г. у вёсцы Плішчыцы гміны Брашэвічы налічвалася 18 карлікавых гаспадарак, на кожную з якіх на надзяленне зямлёю патрабавалася да 7,5 га (у цэлым 45,5 га). Усе малазямельныя паведамлялі, што жадаюць набыць дадатковую зямлю ў навакольным маёнтку Думск ці з зямель царквы ў вёсцы Брашэвічы і не згаджаюцца на продаж сваіх надзелаў і перанясенне гаспадаркі ў іншае месца. Разам з тым у адказе ўлад паведамлялася, што азначаны маёнтак мае плошчу ўсяго ў 95 га, таму не падпадае пад прымусовы продаж, акрамя таго, надзяленне сялян зямлёю парафіяльнай царквы ў Брашэвічах не з'яўляецца магчымым, бо яна ўжо вызначана на надзяленне зямлёю сялян вёскі Брашэвічы [6, Арк. 16зв.].

24 ліпеня 1929 г. у выніку працы Ацэначнай Камісіі землі сялян вёскі Плішчыцы былі падзелены на 7 класаў: 1) добра прыдатныя да апрацоўкі з урадлівым слоем у 40 см па кошту 800 злотых за 1 га; 2) падыходзячыя ў першую чаргу пад агароды, у 35 см, 700 злотых; 3) пад ячмень і жыта, 30 см, 600 злотых; 4) пад авёс і лён, 30 см, 500 злотых; 5) пясчаныя, патрабуючая угнаенняў, 35 см, 400 злотых; 6) мала прыдатныя да апрацоўкі, вільготныя, 25 см, 300 злотых; 7) дрэнна апрацоўваемая зямля, 15 см, 200 злотых [6, Арк. 60].

Значнаю перашкодаю на шляху ажыццяўлення ў Заходняй Беларусі камасацыі быў востры недахоп кваліфікаваных землямераў і іх памочнікаў для правядзення землямерных і меліяратыўных работ. Для ажыццяўлення работ па камасацыі польскія ўлады падбіралі ў асноўным былых афіцэраў-артылерыстаў, матэрыяльна заахвочваўся ўдзел у камасацыі навучэнцаў дарожна-будаўнічых і іншых інжынерных школ [1, s. 163]. Ажыццяўляць камасацыю маглі толькі польскія грамадзяне, у сувязі з гэтым часам узнікалі значныя праблемы. Так, напрыклад, летам 1928 г. адзначалася, што з землямераў, якія праводзілі работы па камасацыі ў вёсцы Вулька і Наваколлі гміны Хомск, толькі адзін збіраўся атрымаць грамадзянства ІІ Рэчы Паспалітай, у той час як іншыя яго навогул не мелі і не распачалі працэс. У цэлым падкрэслівалася неабходнасць давесці працы па камасацыі вёсак да канца, а землямераў заставіць у рэзерве [4, Арк. 22].

Неабходна адзначыць, што першапачаткова камасацыя ажыццяўлялася ў Заходняй Беларусі даволі марудна з-за недахопу ў сялянства сродкаў і будматэрыялаў на перасяленне, таму з мэтаю паскарэння камасацыі 14 студзеня 1927 г. выдадзена сумеснае распараджэнне Міністэрства сельскагаспадарчых рэформ (Ministerstwo Reform Rolnych, МСГР) і Міністэрства Фінансаў аб аказанні дапамогі хутаранам [13]. Дзяржаўная дапамога прадастаўлялася у форме крэдытаў у першую чаргу на перанясенне на новае месца старых пабудоў ці ўзвядзенне новых жылых і гаспадарчых будынкаў на вызначаных надзелах [11, с. 97]. Крэдыт хутаранам выдзяляўся з вызначаных на гэтыя мэты фондаў МСГР у форме дадатковых банкаўскіх пазык пад 4% гадавых (артыкул 3). Уладальнікам новастворaных хутарскіх гаспадарак выдаваўся банкаўскі крэдыт: 1 200 (у выключных выпадках да 2 500) злотых на перанясенне будынкаў і 600 (800) злотых на меліярацыю (артыкул 4), а таксама малазямельным

гаспадарам на набыццё дадатковай ворнай зямлі. Высокасць пазыкі ў стасунку на 1 га новаатрыманага надзела не магла перавышаць сярэднерынкавага кошту зямлі ў дадзенай мясцовасці (артыкул 5). Агульная сума крэдыту на набыццё зямлі на 1 гаспадарку не магла быць больш 1/2 сукупнага кошта ўсіх надзелаў селяніна (артыкул 6).

Польскі ўрад усяляк заахвочваў намер сялян Заходняй Беларусі перасяліцца на хутары, перш за ўсё матэрыяльна. З канца 1934 г., улічваючы значную запазычанасць сялян па аплаце камасацыйных работ, польскімі ўладамі праводзілася іх планамерная адтэрміноўка, таму мясцовыя ўлады маглі зменшыць і нават для найбольш бедных сялян навогуле адмяніць плату за правядзенне неабходных работ па камасацыі. Так, напрыклад, 30 студзеня 1935 г. 12 сялян вёскі Глінна гміны Адрыжын падалі заяву на імя міністра сельскай гаспадаркі, у якой прасілі зняць плату за правядзенне камасацыі, абгрунтоўваючы гэта сваім цяжкім матэрыяльным становішчам [10, с. 111]. У сваёй заяве сяляне адзначалі, што ў сувязі з тым, што "паводкі Каралеўскага канала і р. Піна знішчылі наш ураджай, а ў асаблівасці галоўны наш прадукт – сена, без якога мы матэрыяльна разараны... (Мы) пастанавілі звярнуцца ў найвысокае Міністэрства зямельных рэформ з просьбаю аб ласкавай адмене з нас азначаных выплат за хутарызацыю" [2, Арк. 2]. Пастановаю мясцовых улад азначанае прашэнне сялян было часткова задаволена.

Увогуле паводле справаздачы палескага ваяводы па стану на 1 красавіка 1937 г. у Драгічынскім павеце былі скамасаваны 72 вёскі агульнаю плошчаю зямельных надзелаў у 58 760 га, што складала 57,7% ад патрабуемых работ. Да 1 красавіка 1938 г. уладамі планавалася скамасаваць у павеце яшчэ 26 вёсак, якія ахоплівалі 20 951 га (20,6%) [14, s. 15]. Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што правядзенне польскімі ўладамі ў Драгічынскім павеце ў 1921-1939 гг. камасацыі садзейнічала ліквідацыі цераспалосіцы, вылілася ў паўсюднае насаджэнне эканамічна моцных рынкава арыентаваных фермерскіх гаспадарак, здольных не толькі забяспечваць сябе самастойна, але і пастаўляць прадукты на рынак. Дзякуючы правядзенню хутарызацыі паляпшалася якасць апрацоўкі зямлі і адпаведна ўзрастала яе ўраджайнасць і агульны збор культур. Камасацыя змяншала колькасць працадзён сялянства, патрабуемых для апрацоўкі асабістага надзела, садзейнічала станаўленню капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы рэгіёна, стварала для мясцовых сялян значныя магчымасці для вядзення рацыянальнай гаспадаркі, але не ўсе з іх змаглі імі скарыстацца.

**Список цитированных источников**

1. Гарматны, В.П. Правядзенне камасацыі ў Палескім ваяводстве II Рэчы Паспалітай (1921-1939 гг.) / В.П. Гарматны // Białoruskie Zeszyty Historyczne (Беларускі гістарычны зборнік, Беласток), 2008. – № 30. – S. 162-171.

2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 2067. Заявления граждан и переписка с поветовыми старостами и др. о предоставлении отсрочек при оплате работ за хуторизацию земель.

3. ДАБВ. Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 967. Дело об объединении земель деревни Завершье гмины Бездеж Дрогичинского повета за 1926-1933 годы.

4. ДАБВ. Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 996. Дело об объединении земельных участков деревни Вулька гмины Хомск пов. Дрогичинского за 1926-1929 годы.

5. ДАБВ. Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 1022. Дело об объединении земельных участков дер. Осовница, гм. Мотольской, пов. Дрогичинского за 1928-1937 гг.

6. ДАБВ. Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 1044. Дело об объединении земельных участков дер. Плищицы, гм. Брашевицкой, пов. Дрогичинского.

7. ДАБВ. Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 1074. Дело об укрупнении земельных участков деревни Белин гмины Осовцы Дрогичинского повета.

8. ДАБВ. Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 1370. Дело об объединении земель деревни Лосиньце, гмины Брашевичи, д. Пяхановичи, гмины Воловель, повета Дрогичинского (1928-1930 годы).

9. Здановіч, У.В. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Валовельскай гміны ў 1921-1939 гг. / У.В. Здановіч // Берасцейскі хранограф: зборнік навуковых прац [рэд. рада: М.Э. Часноўскі і інш.]. – Выпуск 4. – Брэст, Академия, 2004. – 396 с. – С. 60-63.

10. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Іванаўскага раёна / Пад агульнай рэдакцыяй В.М. Туркевіча, Л.А. Лавяльчук. – Мінск, БелТА, 2000. – 590 с.

11. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск, Наука и техника, 1968. – 204 с.

12. Dworakowski, B. Wskazówki dla scalających grunty / B. Dworakowski, E. Jasiński. – Warszawa, Nakładem autorów, 1928. – 136 s.

13. Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 14 stycznia 1927 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Skarbu o państwowej pomocy kredytowej przy scalaniu gruntów // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej (DURP). – 1927. – № 6. – Poz. 36. – S. 45-47.

14. Sprawozdanie wojewody Poleskiego na posiedżenie Rady wojewódzkiej w grudniu 1937 r. – Brześć-nad-Bugiem, Druk Związku Rezerwistów, 1937. – 78 s.

15. Ustawa z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntów // DURP. – 1923. – № 92. – Poz. 718. – S. 1050-1056.

## СОЦИОКУЛЬТУРНЫЙ ФЕНОМЕН ИНФОРМАЦИОННОГО ОБЩЕСТВА В ПОЛИТИЧЕСКОМ КОНТЕКСТЕ: ПЕРСПЕКТИВЫ И УГРОЗЫ УТВЕРЖДЕНИЯ ДЕМОКРАТИИ

А.Д. Гегер

*Луцкий национальный технический университет, г. Луцк, Украина*

Информационные технологии и глобальные информационные сети как новые формы социальной организации становятся определяющими тенденциями на пути инновационного развитии общества. По мнению А. Зверинцева, если коммуникация является процессом, следовательно, информация является тем, чем обмениваются при коммуникации [1]. Однако это понятие несколько сужено. Обычно в повседневной жизни информацию рассматривают как знания [2]. По нашему мнению, информация – это коммуникация и связь, в процессе которых устраняется неопределенность. Она также обеспечивает возможность контроля над энтропией, т.е. степенью беспорядка системы. Информация – это фундаментальное свойство Вселенной, позволяющее преобразовывать и управлять материей. Однако подобные свойства информации могут реализоваться только в физической среде. Под этим мы имеем в виду целенаправленное воздействие на объект в соответствии с информацией, которой обладает субъект. На основе подобного взаимодействия, в системе «субъект – объект – информация» осуществляется значительное количество преобразований на разных уровнях. Одним из уровней подобного взаимодействия является социальная жизнь. Информация в данном случае выступает инструментом воздействия на граждан, их сознание. Однако успешность реализации информационного сообщения прямо пропорциональна характеру среды (социальных групп), степени ее лояльности или критичности.

По уровню и характеру оценки информации выделяются два ее типа [2]: объективная (химическая, физическая, биологическая (генетическая), экономическая, правовая) и субъективная (социальная, политическая, психологическая, культурная и т.д.). Таким образом, информация реализуемая в социальной среде, является, в основном, проекцией когнитивных умозаключений индивида и может носить определенную субъективную окраску. Поэтому без проверки и практической апробации, не может позиционироваться как единственно правдивая и правильная. В распространении не-